УДК 1(091)

Э.І. Рудкоўскі, А.М. Дарафееў

# Светапогляд Я. Баршчэўскага

Светапогляд, як вядома, – гэта інтэгральнае ўтварэнне. У яго склад уваходзяць абагульненыя веды: як штодзённыя, жыццёва-практычныя, так і прафесійныя, навуковыя. У ім узаемадзейнічаюць часам міфалагічныя, рэлігійныя і філасофскія кампаненты. У светапоглядзе асэнсоўваецца ўвесь уклад чалавечага жыцця, выяўляецца пэўная сістэма каштоўнасцей, выстрайваюцца «вобразы» мінулага і сучаснага, атрымлівае адабрэнне або асуджэнне той ці іншы вобраз паводзін людзей. Светапогляд здольны пераадолець вузкія рамкі штодзённасці, суадносіць дадзенага чалавека з іншымі людзьмі, уключаючы і тых, што жылі раней і будуць жыць потым. У ім накопліваецца вопыт папярэдніх пакаленняў, які трансліруецца наступным. У светапоглядзе важнае значэнне маюць не веды самі па сабе, а іх ацэнка, якая праяўляецца ў перакананнях. Перакананні – гэта не толькі інтэлектуальная пазіцыя, але і эмацыянальны стан, устойлівая псіхалагічная ўстаноўка, упэўненасць у справядлівасці сваіх прынцыпаў, ідэй, поглядаў, якія, авалодаўшы ўсёй сутнасцю чалавека, падпарадкоўваюць сабе яго пачуцці, волю, учынкі. Усё гэта ўласціва светапогляду Я. Баршчэўскага, яго светаўспрыманню, светаразуменню і светабачанню. Нас будзе цікавіць перш за ўсё яго філасофскі светапогляд.

Я. Баршчэўскі не быў прафесійным філосафам. У яго няма спецыяльных работ па філасофіі. У адным з пісьмаў Я. Баршчэўскі адзначае: «Не даследую я сваёю думкаю таямніцы натуры ці адлегласць да планет. Прырода не дала мне моцнага духу філасофіі, мае думкі нараджаюцца з пачуцця...» [1]. Між тым, аналіз яго літаратурных твораў, пісьмаў дазваляе зрабіць выснову аб наяўнасці ў паэта і казачніка глыбокіх філасофскіх ідэй і палажэнняў. Аб філасофскіх поглядах Я. Баршчэўскага можна меркаваць па зместу тых думак і разважанняў, якія пісьменнік укладвае ў вусны сваіх герояў, і якім ён яўна сімпатызуе.

Я. Баршчэўскі спрабуе па-філасофску асэнсаваць розныя аспекты адносін чалавека да навакольнага свету. На іх падставе можна скласці ўяўленне аб светапоглядзе, светаадчуванні нашага славутага земляка. Перш за ўсё трэба адзначыць, што, ў цэлым, на яго светапогляд аказала ўплыў філасофія сярэднявечча, гнасеалагічныя, этычныя і эстэтычныя сістэмы рамантыкаў. Беларускі рамантызм першай паловы XIX ст. не быў «чыстым» або завершанай плынню ў эстэтыцы. У ім спалучаліся рысы дваранскага асветніцтва, дыдактызму і сентыменталізму з характэрнай для рамантыкаў арыентацыяй на духоўныя каштоўнасці народа. У этыцы і эстэтыцы рамантызму фарміруецца глыбокая павага да індывідуальнасці чалавечай асобы, а таксама да індывідуальнасці кожнага народа, яго культуры і ладу жыцця.

На светапогляд Я. Баршчэўскага не магла не аказаць уплыў таксама схаластычная філасофія, якая атрымала распаўсюджванне ў Рэчы Паспалітай у канцы XVII – пачатку XVIII стагоддзяў. У канкрэтных умовах Беларусі схаластычная філасофія, нягледзячы на ўсе недахопы, была адной з форм

далучэння да антычнай і сярэднявечнай філасофскай спадчыны. Як вядома, для гэтага накірунку быў характэрны правідэцыялізм: сцвярджалася ідэя аб боскім кіраўніцтве ходам гісторыі і чалавечага лёсу (В. Тылкоўскі, Я. Пашакоўскі). У «Гістарычным і палітычным календары на 1739 г.» Я. Пашакоўскі падкрэсліваў, што пры ўзнікненні супярэчнасцей паміж верай і розумам у тлумачэнні з'яў прыроды, неабходна прытрымлівацца веры, а не розуму, таму што «вера больш надзейная, чым наш розум». Спасылаючыся на аўтарытэт Аўгусціна блажэннага, ён падкрэсліваў: «Бог можа больш здзейсніць, чым мы можам зразумець». І філасофскія пазіцыі Я. Баршчэўскага знаходзяцца ў гэтым рэчышчы. Я. Баршчэўскі імкнуўся адлюстраваць у сваіх творах асаблівасці нацыянальнага характару і светаўспрымання беларуса, сцвердзіць ягоную годнасць, абудзіць гістарычную памяць. Пісьменнік выкарыстоўвае патэнцыял фальклорна-рэлігійнай міфалогіі беларусаў, якая з'яўлялася сімбіёзам дзвюх сістэм – сваёй, спрадвечнай (з паганскіх часоў) і хрысціянскай. Спалучэнне паганскай міфалогіі з хрысціянскай дагматыкай у беларусаў, як вядома, было вельмі моцным. І гэты эклектыцызм – галоўная адметнасць беларускага нацыянальнага светапогляду.

У творах Я. Баршчэўскага мы сустракаем многія сімвалічныя вобразы: Чарнакніжнік, Белая Сарока, Плачка і др. Праз гэтыя вобразы раскрываецца светапогляд простых людзей, якія жылі на Беларусі. Чаму з'явіліся гэтыя вобразы-сімвалы? Зразумела, што ў іх аснове ляжала неадукаванасць сялян. Гэта і нарадзіла нядобрых духаў, якія дзейнічаюць на карысць злым панам. У той жа час пісьменнік уводзіць вобраз, які супрацьстаіць усім нядобрым духам. Такім вобразам з'яўляецца Плачка. У гэтым вобразе прадстаўлена Беларусь, якая апекуецца над «сваімі няшчаслівымі дзецьмі».

Светапогляд Я. Баршчэўскага ў цэлым з'яўляецца аб'ектыўна-ідэалістычным. У прыватнасці, ён стаіць на пазіцыях крэацыянізму: Бог з'яўляецца адзіным творцам навакольнага свету і пастаянна накіроўвае ход спраў у ім. У гэтым сутнасць анталагічных поглядаў пісьменніка: «... вечаровай парою адкрыецца старонка, на якой мільёнамі зіхаткіх угары зорак напісана Божая ўсемагутнасць. На зямлі, пакрытай безліччу раслін і жывёл, я чытаў аб міласэрнасці і волі творцы.» [1, с. 83]. Чалавек – гэта частка прыроды, ён тысячамі нітак звязаны з ёй і павінен вучыцца ў яе, шукаць у ёй натхненне. «Гэтая кніга прыроды вучыла мяне сапраўднай паэзіі, сапраўдным пачуццям лепей, чым сённяшнія гаворкія крытыкі, якія чужыя пачуцці і розныя здольнасці, дадзеныя чалавеку ад Бога, хочуць, быццам фрак, перашыць на сваю фігуру» [1, с. 83]. Я. Баршчэўскі па-майстэрску апісвае родную прыроду, падкрэслівае адзінства чалавека з ёю: «Кніга таямніц духа і прыроды хоць і не даследавана, хоць нельга яе прачытаць да канца, аднак напісана яна для чалавека. Прыемна, чытаючы яе, здзіўляцца мудрасці Творцы.» [1, с. 411]. Гармонія з прыродай дазваляе чалавеку весці прыстойны лад жыцця. Менавіта, жыццё ў адпаведнасці з прыродай разглядаецца Баршчэўскім як адзіна маральнае і праведнае. Такой пазіцыі, як вядома, прытрымліваліся і старажытнагрэчаскія філосафы. Вось чаму ён аддае ім перавагу перад сучаснымі (пісьменніку – аўт.) філосафамі. Вуснамі аднаго свайго героя пісьменнік разважае: «Я з большым задавальненнем чытаю старажытных грэцкіх філосафаў: яны шчыра шукалі святла і праўды і часам асобным з іх удавалася хоць здалёку ўбачыць прамень вечнага святла. Цяпер, калі нябеснае сонца Евангелля свеціць усяму свету, яны блукаюць у цемры і самі ня ведаюць, чаго шукаюць; назвалі чалавечую душу часткаю Бога, а яна ж – стварэнне Божае, як і іншыя ўсе душы.» [1, с. 333].

А цяпер звернемся да гнасеалагічных пазіцый пісьменніка. Чалавек імкнецца пазнаць навакольны свет. Але працэс пазнання бясконцы,

бязмежны. «У кожнаю эпоху прырода – непрачытаная кніга; шчаслівы, хто добра разгледзеў свет, у якім жыве, і ўваскрэсіў частку мінуўшчыны; каб расказаць пра ўсе цуды – мала слоў у чалавечай мове.» [1, с. 329]. І яшчэ: «Чалавек не можа бачыць і чуць далей, як яму прырода дазволіла». [1, с.216]. Трэба адзначыць, што Я. Баршчэўскі удзяляў вялікую ўвагу суадносінам розуму і веры. Пры гэтым ён аддае прярытэт веры перад розумам: « ... вывучай таямніцу ўсіх мінулых стагодзяў і цяперашняга свету, – і ўсюды ўбачыш цуды, якія іншым і не сніліся; убачыш руку творцы, але не пераступай межаў і не даследуй дух, бо тут патрэбна вышэйшая сіла, тут патрэбна яснабачанне; не забывай, што ты чалавек; не аддаляйся ад свайго цела без волі Таго, хто цябе з ім злучыў, і вокам тваёй душы не ўзірайся ў іншую душу, якая створана як і твая.» [1, с. 334]. У другім месцы мы чытаем:

Дарма халодны розум шчасця дзесь шукае,
Дарма магутны розум лічыць слуг бясконца;
Сумленнага прадбачнасць акрыляе,
Што ўночы зоркі, тое ўдзень запаліць сонца [1, с. 251].

І яшчэ: «Цуды можна разумець сэрцам, а не навукаю» [1, с. 173].

Значнае месца Я. Баршчэўскі адводзіць сацыяльным праблемам: дабра і зла ў жыцці чалавека, справядлівасці, сэнсу жыцця, шчасця і г.д. Так, напрыклад, разглядаючы прычыны сацыяльнага зла, ён бачыў іх у эгаізме людзей. Пісьменнік укладвае ў вусны аднаго з герояў сваіх навел наступнае: «... прычына ўсяму – глупства шляхты, хцівасць і нязгода паноў» [1, с. 219]. У другім месцы мы чытаем: «...паны не дбаюць, каб іх людзі былі пабожныя і жылі ў згодзе, як браты. Адкажуць яны перад Панам Богам.» [1, с. 159]. Пры гэтым адчуваецца ідэалізацыя мінуўшчыны, настальгія па «залатому веку». Раней «ураджаі былі лепшыя, весела спяваючы, працавалі араты ў полі, у лясах вялося безліч ласёў і дзікіх коз, і паляўнічы лёгка знаходзіў звера, і рыбак упэўнена закідаў нерат у воду. Але калі людзі размежылі жалезным ланцугом палі і лясы, калі кожны захацеў стань багатыром, мець дарагую вопратку і пышныя карэты, – усё змянілася на свеце, багатыя пачалі прыцясняць бедных, і угневаны Бог не благаславіў людскую працу, змяніліся ўраджаі...» [1; с. 199-200]. Тэхнічны, сацыяльны і навуковы прагрэс суправаджаецца падзеннем нораваў, лічыць шляхціц Завальня: «...гэта папярэджанне людзям, каб выправілі свае норавы. Але прыкра, што цяпер людзі такія разумныя, што яны ўсё ведаюць, ні ў якія цуды не вераць, ім трэба скарбы, каб не працуючы, мець усё, што толькі заманецца» [1, с. 174]. А другі герой адзначае: «Цяпер жалезны век – чалавек лёгка робіцца горшы» [1, с. 308]. Такім чынам, сучасны свет супярэчлівы, складаны, а часта варожа накіраваны да чалавека: «Свет не рай, а людзі не анёлы» [1, с. 309]. «Няма праўдзівага шчасця, няма раю на гэтай зямлі» [1, с. 317]. Дзе ж выйсце? Пісьменнік яго бачыць у міласэрнасці, працавітасці, любві да Бога, святога Евангелля. Звернемся да яго твораў. «Памятай заўсёды такую прыказку: як пасцеліш, так і выспішся. Калі літасцівы Бог дасць табе добры лёс – развражае адзін з герояў навелы «Бура», – і ўладу над сваімі зямнымі скарбамі – не шкадуй бліжнім, памятаючы, што міласэрныя атрымаюць міласэрнасць і будуць спадчыннікамі царства нябеснага» [1, с. 178]. Я. Баршчэўскі рэзка асуджае тых паноў, якія клапоцяцца толькі аб сваім дабрабыце і з пагардай ставяцца да спрадвечных традыцый і звычаяў народа, яго ладу жыцця. «Не з фабрык трэба пачынаць грамадзянам беларускім, каб палепшыць свой быт, – сцвярджае адзін з герояў, – а з зямлі, бо сялянская гаспадарка найбольш прыносіць карысці ў нас, трэба рупіцца заводзіць жывёлу, угнойваць палеткі, павялічваць сенажаці і сваіх падданых навучаць лепшым маральным канонам, каб любілі сваю бацькаўшчыну. Не

крыўдзіць, прысвойваючы іх уласнасць, меньш будаваць корчмаў і старацца мець больш збожжа ў запасе» [1, с. 180]. Можна пагаджацца, альбо не з такімі разважаннямі з эканамічнага пункту гледжання і з пазіцый сённяшняга часу, але нельга не бачыць іх высокага маральнага сэнсу. Ацэньваючы роль Бібліі ў жыцці кожнага чалавека, наш славуты зямляк сцвярджае ў адным са сваіх пісьмаў: «Адна гэта кніга магла б служыць свету з большай карысцю, чым найграмаднейшая бібліятэка. Калі б толькі людзі хацелі шукаць у ёй праўду; гэтая кніга – крыніца сапраўднай мудрасці, яна вучыць пазнаваць свае абавязкі перад бліжнім і Богам» [1, с. 415].

Не абходзіць Я. Баршчэўскі і такую філасофскую праблему, як праблема шчасця і сэнсу чалавечага існавання. Вытокі першага ён бачыць у добрасумленнай працы, каханні і павазе да Бога: « ... людзі ўсюды такія самыя, там толькі шчасце, дзе чалавек жыве так, як Бог загадаў, працуе рупліва і без хцівасці, не забывае бліжніх, спадзяецца на лепшае» [1, с. 252]. Далей мы чытаем: «Хто працуе і спадзяецца на Бога – можа і тут быць шчаслівы і спакойны» [1, с. 253]. І яшчэ нельга не адзначыць такія радкі: « ... дзе ў хаце каханне і згода, там і згода, там і блаславенне Божае» [1, с.109]. Важнейшай якасцю чалавека з'яўляецца здольнасць прыйсці на дапамогу чалавеку, які апынуўся ў складаных абставінах жыцця. «Жыццё кожнаму дарагое: чалавек, як можа, ратуе сябе ад няшчасця; сурова будзе судзіць Бог таго, хто перад нешчаслівым зачыняе дзверы» [1, с. 180].

Трэба адзначыць, што ў сваім разуменні сэнсу чалавечага існавання, Я. Баршчэўскі прытрымліваецца той філасофскай традыцыі, якая бярэ пачатак ў філасофіі Арыстоцеля, а потым была ў той ці іншай ступені выкарыстана і хрысціянскай філасофіяй у выглядзе арыстоцелізму. Вядома, што знакаміты антычны філосаф бачыў шчасце чалавека не ў задавальненнях, не ва ўшанаваннях і не ў багацці. Апошняе – гэта сродак для чагосьці іншага і як мэта сэнсу не мае. Мэта чалавечага існавання і сутнасць шчасця – ва ўдасканаленні сябе як чалавека, у актыўнасці душы, згоднай з дабрачыннасцю. У «Шляхціцы Завальні» мы чытаем: «Божая рука папярэджвае вас, што няма нічога сталага на зямлі, гмахі вашы ператорацца ў руіны, моц, багацці, гонар і слава рассеюцца і знікнуць, як лёгкі дым у паветры ... імя іх (знакамітых людзей – аўт.) сканае ў пустэльні нябыту, калі ў жыцці не ўвянчалі яны свае галовы каронаю праўды» [1, с. 199]. У рэшце рэшт, жыццё на гэтай зямлі мае сэнс толькі тады, калі яно з'яўляецца падрыхтоўкай да жыцця вечнага: «Заўседы такая смерць (жахлівая – аўт.) тым людзям, што шукаюць шчасця на гэтым свеце, а пра будучае жыццё не дбаюць» [1, с. 195].

Нельга не адзначыць і такую адметную рысу светапогляду Я. Баршчэўскага, як патрыятызм, любоў да родных мясцін, традыцый і звычаяў свайго народа. Знаходзячыся далёка ад родных мясцін, пісьменнік разважае: «Дзікія лясы мілей за пышныя паркі! Шум вашых галін акунаў мяне ў роздум, у засені вячыстых дрэў заўсёды адчуваў я нейкія неразгаданыя таямніцы прыроды. У народных апавяданнях сустракаў пачуццё і праўду, адчуваў іх мудрасць і малітвы цэлага народа, мілей гэта ў сто разоў, чым халодныя забаўкі ў багатых салонах» [1, с. 198]. Людзі, канешне, не заўсёды жывуць у родных мясцінах, але галоўнае, каб «Бог падмацаваў іх сэрцы любасцю да бацькоўскіх звычаяў» [1, с. 254].

Такім чынам, аналіз асноўных твораў Я. Баршчэўскага дазваляе сцвярджаць, што яго светапогляд быў глыбока рэлігійным. Гэта праходзіць чырвонай ніткай праз яго навелы і пісьмы. «Не перамены надвор'я, альбо часу распараджаюцца чалавечым жыццём, а Той, хто кіруе Небам і Зямлёю» [1, с. 418]. Нездарма філосаф-атэіст (герой адной з навел) сутыкаецца з рознымі напасцямі: «Ён не пакінуў займацца ашуканствам, а пасля асмеліўся нават

надрукаваць свае разважанні, што супярэчылі рэлігіі і здароваму розуму, (іх супадзенне для аўтара бясспрэчнае – аўт.) у часопісе. Яго старыя суседзі, якім гэта чытаў, папярэджвалі: – Пакінь свае памылкі; вер так, як верылі твае бацькі. Яны жылі шчасліва і спакойна; іх простая вера заслужыла ўзнагароду. Якая ж праўда вышэйшая за праўду веры? Бог яе сам аб'явіў у Евангеллі, і гэтая мудрасць, як сонца нябеснае, асвятляе цэлы свет і кажа пра таямніцы. Чалавечы розум няхай супакоіцца, бо гэта за мяжою яго разумення. Памылковыя думкі вядуць народ да бяды, а веру – да ганенняў» [1, с. 306].

Светапогляд Я. Баршчэўскага пранікнуты чалавечнасцю, гуманізмам. Любоў да Бога і любоў да чалавека для яго неразрыўныя. У яго светапоглядзе пісьменніка адлюстравалася гісторыя беларускага народа, яго ментальнасць, філасофія і стаўленне да жыцця.

## ЛІТАРАТУРА

1. *Баршчэўскі Ян*. Выбраныя творы. Мн., 1998. – 480 с.

*S U M M A R Y*

*In this article Borschevsky's philosophic outlook is evaluated. The analysis of ontological, gnoseological and ethical approaches has been provided.*

*Поступила в редакцию 4.02.2001*

УДК 378. 414

**Е.Э. Кривоносова**

# Прожективные ориентации студенческой молодежи

Мы часто слышим фразу «молодежь – шанс на будущее», которая подчеркивает особый статус данной возрастной категории населения как социального ресурса развития и обновления нашего общества. Поэтому уже сегодня важно определить, способно ли молодое поколение взять на свои плечи весь груз ответственности за продуктивные преобразования страны. Этой цели и посвящено настоящее исследование, проведенное сотрудниками кафедры философии. Мы надеемся, что результаты исследования помогут лучше узнать мировоззрение, мироощущение, жизненную позицию, самооценку молодых людей, и, следовательно, будут способствовать корректировке в нужном направлении учебно-воспитательного процесса.

Данная статья посвящена описанию панорамы жизненных планов студенческой молодежи. Мы исходили из предположения, что выявленные в ходе исследования ценностные ориентации студенчества дают определенное представление о том, как они соотносят себя с окружающей действительностью, имеют ли возможность реализовать себя в ней, какова связь их прогностической модели жизни с прошлым и настоящим страны.

Следует отметить, что в современных условиях молодежь пользуется гораздо большей автономией, чем раньше. В недавнем прошлом система идейно-воспитательной работы была поставлена под жесткий контроль государст-